*В. Ф. Красюк,*
*кандыдат філасофскіх навук,*
*дацэнт кафедры філасофіі*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта*
*культуры і мастацтваў*

# ПЕРАЕМНАСЦЬ ДУХОЎНАЙ СПАДЧЫНЫ МЯФОДЗІЯ І КІРЫЛА Ў БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ XIX СТАГОДДЗЯ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вялікія асветнікі Мяфодзій і Кірыл заклалі падмуркі культуратворчай дзейнасці, плён якой стаўвядомы ў вяках, закрануў духоўнае жыццё розных народаў і адазваўся ў раскрыцці мадэрных напрамкаў нацыянальных культур. XIX стагоддзе характарызуецца як эпоха абуджэння народаў краін Еўропы. У Беларусі ў гэты час мела месца актывізацыя нацыянальнага руху, культурнае Адраджэнне, станаўленне новай літаратуры, асветніцкая дзейнасць. Негледзячы на цяжкія сацыяльна-палітычныя ўмовы ўзраслі жыватворныя парасткі сталення народнай культуры, якія дапаўняліся праекцыямі развіцця еўрапейскага духоўнага жыцця.

Для Беларусі характэрнай асаблівасцю было тое, што пачынальнікамі ўздыму культурнага жыцця былі прадстаўнікі рамантызму, што выступаў як феномен сінтэзу духоўнага жыцця Беларусі ў пачатку XIX стагоддзя. Ён заклаў падмуркі далейшых этапаў нацыянальнага станаўлення, стаўшы вестуном Асветніцтва і Адраджэння. Рамантызм пачынае распаўсюджвацца ў Беларусі у 20–30-я гады XIX ст. як напрамак культуратворчай дзейнасці, які меў розныя па сацыльна-палітычнай арыенціроўцы формы. Гэтаму спрыяла складанасць жыцця тагачаснага грамадства, дысгарманічнасць яго эканамічных, палітычных і духоўна-культурных працэсаў. Крызіс прыгонніцкай сістэмы, пагрозы пачынаючай браць разгон капіталістычнай рэчаіснасці, няўтульнае ўладкаванне зямель былога Вялікага Княства Літоўскага ў межах Расійскай імперыі пасля падзелу Рэчы Паспалітай, сутыкненне асаблівасцей мясцовай культуры, у якой пераважаў польскі элемент, у супраціў якому пашыраўся імперскі ўплыў, рост нацыянальнага самавызначэння беларускага народа абумовілі

пашырэнне подыху рамантызму. Ён імкнуўся аб'яднаць стракатасць культурнага жыцця тагачаснага грамадства, выкарыстоўваючы ідэалізацыю мінуўшчыны, патрыятычны парыў лепшых сыноў Айчыны ў іх імкненні зрабіць добрае для свайго краю і яго народа.

Цяжкасці ў featured рознабаковым жыцці краю былі ў тым, што, у прыватнасці, сустрэліся з прэтэнзіямі на панаванне дзвюх дамінуючых, асабліва ў вярхах грамадства, культур – польскай і рускай; адначасова набірала моц беларуская ідэя. Свае спецыфічныя рысы мела рэлігійнае жыццё: большасць беларусаў была уніятамі, шляхетства і магнатэрыя – у асноўным Каталікамі, а царызм усялякімі прыемамі спрыяў праваслаўю. На гэтай глебе адбывалася глухое супрацьстаянне, адгалоскі якога патаналі ў традыцыйнай для беларускай зямлі рэлігійнай верацярпімасці.

Рамантызм у сваім развіцці выйшаў за межы мастацкай накіраванасці і ахапіў розныя бакі ідэалогіі і культуры, рэлігійнага жыцця, сацыяльных адносін. Ужо ў дзейнасці філаматаў і філарэтаў спалучаліся хвалі Асветніцтва і эстэтыка-гістарычнага пошуку, у якіх праступалі рысы інтэграцыйнага плану.

Рамантызм прапаведваў еднасць людзей, якую бачыў ва ўтапічных ідэалах, марыў аб дасканаласці чалавека і свету, гаварыў аб спачуванні ўсім прыгнечаным, звяртаўся да народа і ягонай годнасці незалежна ад нацыянальных і рэлігійных асаблівасцей. На першым плане была маральная годнасць людзей, якія не перарывалі сувязі з сельскім жыццём. Пашыранай з'явай было патрабаванне народнасці і нацыянальнай самабытнасці культуры, павагі да веры дзядоў і прадзедаў.

Ранні беларускі рамантызм супадаў у часе з пачаткам станаўлення беларускай нацыі. У гэтую эпоху – Рамантызму і Асветніцтва – канчаецца аднабаковы працэс паланізацыі пануючых саслоўяў беларускага насельніцтва, пачынаецца адваротны працэс – вяртанне часткі мясцовай інтэлегенцыі да свайго народа. Зблізіцца з сялянствам можна было толькі на аснове роднай мовы, прызнання годнасці яго культурных адметнасцей і рэлігійных асаблівасцей. Пры ўсёй адноснасці падыходу канфесійныя адрозненні для рамантыкаў былі не на першым плане, галоўнымі выступалі духоўныя якасці асобы, працалюбівы характар народа.

Рамантыкі здолелі ў сваім парыве абудзіць усе жыватворныя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сілы краю для служэння яму, яго народу, перайсці да аб'яднання магчымых сацыяльных сіл – у гэтым руху былі прадстаўнікі розных саслоўяў і веравызнанняў. Крытычна ставячыся да ўсяго таго, што раз'ядноўвала людзей, яны імкнуліся вывучыць і прапагандаваць усё лепшае, створанае народам, і перш за ўсё – фальклор, абрады, традыцыі. Больш за тое, сінтэзацыі падлягалі падмуркі тагачаснай культуры, якія не былі звязаны з хрысціянскім рытуалам, але ўвайшлі ў духоўна-побытавы пласт народнай жыццядзейнасці. Прыклад таму – паэма «Дзяды» Адама Міцкевіча, дзе прасочваюцца язычніцкія карані народных традыцый.

Эстэтычны ідэал прадстаўнікоў ранняга і пазнейшага рамантызму не прымае таго, што зневажае людзей – пачварнасці, агіднасці, брыдоты; яго ўвага накіравана на пошук прыгажосці ўчынкаў і дзеянняў, якія спрыяюць маральнаму ўдасканаленню. Гэта знайшло адлюстраванне ў літаратурна-мастацкай творчасці, у якой вывучалася і прапагандавалася гісторыя, этнаграфія, рэлігійнае жыццё беларускай зямлі. Выдатнымі прадстаўнікамі рамантызму былі Адам Міцкевіч, Ян Чачот, Уладзіслаў Сыракомля, Рамуальд Падбярэзкі, Ян Баршчэўскі, Вінцэсь Каратынскі і іншыя – у літаратуры, Ян Дамель, Валенцій Ваньковіч, Вікенцій Дмахоўскі, Міхал Андрыёлі – у выяўленчым мастацтве.

На хвалі рамантызму адбывалася культурная дыфузія, узаемапранікненне беларускай і польскай культуры. Сяброўства А. Міцкевіча з А. Пушкіным і дзекабрыстамі сведчыла пра збліжэнне з перадавымі прадстаўнікамі рускага інтэлектуальнага жыцця.

Сярод польскага элементу краю, а менавіта яго прадстаўнікі былі вестунамі новых напрамкаў і стыляў у культурна-мастацкім жыцці, спаланізаваных магнатаў і шляхты выдзяліліся два лагеры. Адзін быў каталіцка-рэакцыйным, шавіністычным, стаяў на пазіцыях адзінай Рэчы Паспалітай. Другі прытрымліваўся прагрэсіўнага накірунку, выступаў за адраджэнне Вялікага Княства Літоўскага, звязваў сваю сутнасць з тутэйшым народам, яго інтарэсамі і культурай. Менавіта ў гэтым асяродку прарастала тая краёвая «ліцвінская» ментальнасць, якая вяла да інсталяцыі беларускай самасвядомасці. Яна бачылася ў цеснай узаемасувязі з сацыяльна-палітычнымі і культурнымі працэсамі суседніх народаў, іх духоўнымі набыткамі. У той жа час характэрнай рысай «ліцвінкасці» было ўсведамленне гістарычнай і культурнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

значнасці сваёй зямлі.

Сталенне ліцвінскай краёвасці, паступовая экспансія рускай культуры, што пачалася з часу далучэння Беларусі да Расійскай імперыі, вялі да таго, што кансерватыўныя польскія колы сталі весці барацьбу за край. Гэта праявілася ў добразычлівых адносінах да беларускай гісторыі, культуры, мовы. Памяркоўна-кансерватыўны польскамоўны альманах «Рубон» праявіў зацікаўленасць да беларусаў, прэзентаваў сябе як беларускае выданне. Ён зазначаў самабытнасць беларускай культуры, друкаваў этнаграфічныя і фальклорныя матэрыялы, радкі беларускай паэзіі.

Краёвасць усё больш нагадвала аб сабе, свядома і несвядома ліцвінства злівалася з культурай беларускага этнасу. Папярэднікамі пачынальнікаў новай беларускай літаратуры былі прадстаўнікі адначасова як польскай, так і беларускай культуры і літаратурнай творчасці, многія з іх па нараджэнню ці па тэматыцы і матывах дзейнасці былі звязаны з Беларуссю. З рамантызму пачыналася беларускае Адраджэнне. Яго вестуны, існуючы ў польскім духоўным асяроддзі, жылі і тварылі ў Беларусі, захапляліся яе гісторыяй, натхняліся яе прыродай, арганічна ўваходзілі ў свет людзей краю, які лічылі сваёй Бацькаўшчынай. Таму лёс беларускай культуры натуральна пераплятаўся з лёсам польскай, а затым і рускай культур. Сярод шырокіх колаў мясцовай інтэлегенцыі пашыралася цікавасць да мінулага Беларусі. Паступова з польскамоўнага літаратурнага руху вылучаецца так званая беларуская школа, творчасць якой была прысвечана роднай старонцы. Амбівалентнасць у плане разумення сваёй нацыянальнай прыналежнасці была ўласціва многім пачынальнікам новай беларускай літаратуры і мастацтва, а аўтарскі білінгвізм вёў не да канфліктавання, а да суіснавання дзвюх творчых мадэлей [1, с. 7–8].

Рамантызм адыграў у культурным жыцці Беларусі інтэграцыйную ролю. У ім увасобіліся творчыя намаганні прадстаўнікоў роднасных народаў. Ён абагульніў удзел прадстаўнікоў розных канфесій у справе гістарычнага станаўлення беларускага народ. Хаця ў гэты час асноўную рухаючую сілу Адраджэння састаўлялі прадстаўнікі каталіцызму і ўніяцтва, а таксама кальвінізму, агульная накіраванасць на беларускую ідэю далучала да адраджэнскага руху і праваслаўныя колы, якія пазней заявілі аб

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сабе гучна. Напрыклад, беларускія народнікі, што гуртаваліся вакол часопіса «Гоман», была выхадцамі з праваслаўнага духавенства, праваслаўнай шляхты, мяшчан, служылых людзей. Такім чынам, сінтэзуючая роля рамантызму як плыні культурнага жыцця станоўча паўплывала на фарміраванне духоўнага аблічча беларускага народа ў перыяд яго нацыянальнага станаўлення і самавызначэння. Рамантызм спрыяў адраджэнню гістарычнай спадчыны і падаў штуршок праекцыям у будучыню. Яго такой галоўнай праекцыяй быў рэвалюцыйны дэмакратызм, які абапіраўся на прынцып крытычнага рэалізму. У творчасці яго прадстаўнікоў знайшлі яскравае развіццё новыя беларускія літаратура і мастацтва. Асветніцкая дзейнасць праз гармонію народных, нацыянальных і сацыяльных матываў абуджала народ да Адраджэння сваёй культуры, яе пад'ёму на новым этапе гістарычнага развіцця.

*Мархель, У.* Праз спадчыну – да сябе / У. Мархель // Раса нябёсаў на зямлі тутэйшай. Беларуская польскамоўная паэзія XIX стагоддзя / уклад., прадм. і камент. У. Мархеля. – Мінск : ППП імя Я. Коласа, 1998. – С. 6–11.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ